УДК 811.161.3’373:003.332.5“18”

Нематываваныя абстрактныя назоўнікі ў кітабе XIX ст.

Несцяровіч В.І.
Установа адукацыі “Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава”

Адным з найбольш яркіх паказчыкаў функцыянавання мовы з’яўляецца абстрактная лексіка. У помніку ісламскай культуры XIX ст. шырокае адлюстраванне атрымалі нематываваныя абстрактныя назоўнікі. Мэта даследавання заключаецца ў выяўленні і аналізе іх семантычных і функцыянальных асаблівасцей.

Матэрыял і метады. *Матэрыялам з’яўляюцца транслітараваныя з арабскага пісьма беларускамоўныя тэксты Кітаба А. Хасяневіча (1832). У працы выкарыстаны лексікаграфічны, параўнальна-супастаўляльны і дыстрыбутыўны метады і элементы колькасных падлікаў.*

Вынікі і іх абмеркаванне. *У артыкуле характарызуецца лексіка-семантычны разрад нематываваных абстрактных назоўнікаў: высвятляецца крыніца іх паходжання, значэнне, функцыянаванне ў мове манускрыпта, графіка-арфаграфічнае афармленне, ацэньваецца ступень замацаванасці ў слоўніку новай беларускай мовы. Акрамя гэтага праводзіцца аналіз тэматычнай накіраванасці нематываваных абстрактных назоўнікаў, вылучаюцца стрыжнёвыя лексемы з адцягненым значэннем, якія выяўляюць адметнасць арабскаалфавітнага помніка ісламскай культуры.*

Заключэнне. *Аснову абстрактных нематываваных назоўнікаў утвараюць славянскія назвы. У мове помніка яны з’яўляюцца спецыяльным сродкам выражэння адцягненых паняццяў. Пераважная большасць гэтай лексікі ўваходзіла ў слоўнік старабеларускай мовы XV–XVI стст., што сведчыць пра лексічную пераемнасць паміж старабеларускай і новай беларускай мовай.*

Ключавыя словы: *абстрактны назоўнік, адцягненае значэнне, кітаб, лексіка, нематываваны назоўнік.*

(Ученые записки. – 2016. – Том 21. – С. 204–208)

Unmotivated Abstract Nouns in the Kitab of the XIXth Century

Nesciarovich V.I.
Educational Establishment “Vitebsk State P.M. Masherov University”, Vitebsk

One of the significant markers of the language functioning is the system of abstract nouns. In the Islamic monument of literary work of the XIXth century the unmotivated abstract nouns are widely spread. The aim of the research is to identify and analyze the semantic and functional features of abstract nouns.

The material and methods. *The material of the research is the Belarusian language texts of the Arabic writing in Kitab by A. Hasyanevich (1832). We used lexicographical, comparative and distributional methods as well as some elements of quantitative analysis.*

Findings and their discussion. *The lexical and semantic subgroup of unmotivated abstract nouns has been presented including the origin of the nouns, their meaning and functioning in the language, graphics and spelling, the level of spreading in the Belarusian language. Apart from it, the analysis of the groups of the unmotivated abstract nouns has been made. The dominant lexemes with the abstract meaning that reflect the specificity of the monument of the Islamic culture has been released.*

Conclusion. *The basis of unmotivated abstract nouns is formed by Slavic names. They are specific means of reflecting abstract notions. The majority of this lexical system is included into the old Belarusian language of the XV–XVIth centuries that present the links between the old Belarusian language and the new Belarusian one.*

Key words: *abstract nouns, abstract meaning, kitab, vocabulary, unmotivated noun.*

(Scientific notes. – 2016. – Vol. 21. – P. 204–208)

Кітаб Абрагіма Хасяневіча (1832) адносіцца да помнікаў ісламскай пісьмовай культуры, у склад якога ўваходзяць рэлігійныя (пераважна), фальклорныя і літаратурныя творы і ў якім дамінуючай з’яўляецца беларуская мова. Спісаны гэты помнік з іншых копій у першай трэці XIX ст., што супадае з пачатковым перыядам гісторыі новай беларускай мовы і надзейна адлюстроўвае яе тагачасны стан. Адным з найбольш яркіх паказчыкаў функцыянавання і стану мовы з’яўляецца абстрактная лексіка, якая атрымала шырокае адлюстраванне ў згаданым арабскаалфавітным рукапісе. У артыкуле прыводзяцца вынікі назіранняў за функцыянаваннем абстрактных назоўнікаў у беларускамоўных тэкстах кітаба. Арыенталізмы, якімі ў помніку абазначаюцца разнастайныя абстрактныя паняцці рэлігійнага або свецкага характару, у публікацыі не разглядаюцца. Тэрміны *адцягнены* і *абстрактны* ў дачыненні да назоўнікаў прымяняюцца як раўнапраўныя, нягледзячы на рознае трактаванне іх значэнняў некаторымі лінгвістамі.

Адрас для карэспандэнцыі: e-mail: nesciarka@mail.ru – **В.І. Несцяровіч**

Мэта даследавання заключаецца ў выяўленні і аналізе семантычных і функцыянальных асаблівасцей абстрактных назоўнікаў у мове кітаба. Актуальнасць даследавання абумоўліваецца выкарыстаннем вывадаў, якія прыводзяцца ў публікацыі на падставе аналізу значэння і ўжывання абстрактных назоўнікаў, іх графіка-арфаграфічнага афармлення, высвятлення крыніцы паходжання, пры вырашэнні праблемы лексічнай пераемнасці паміж старабеларускай і новай беларускай літаратурнай мовамі.

Матэрыял і метады. Матэрыялам з'яўляюцца транслітараваныя з арабскага пісьма беларускамоўныя тэксты Кітаба А. Хасяневіча (1832). У працы выкарыстаны параўнальна-супастаўляльны, дыстрыбутыўны метады і элементы колькасных падлікаў.

Да лексікі з адцягненай семантыкай аўтарам адносяцца словы са значэннем прыметы, якасці, адцягненага дзеяння і выніку такога дзеяння, якія на ўзроўні лагічнага асэнсавання становяцца самастойнымі прадметамі думкі, а на лінгвістычным – маюць адпаведнае лексіка-граматычнае афармленне ў манускрыпце: *вера* 'вера, рэлігія, веравызнанне', *вола* 'улада, магутнасць'; 'дазвол, згода, рашэнне, загад', 'жаданне', 'бласлаўленне', 'вызваленне ад прыгоннай залежнасці або ад выканання павіннасцей', *гнев, дар* 'здольнасць да дабрадзейства', *кривда* 'крыўда'; 'несправядлівасць'; 'ганьба', *лиха* 'зло' і да т.п. (тут і далей курсівам запісваюцца транслітараваныя з арабскага пісьма словы і сказы).

У гісторыі славянскага мовазнаўства вядомы і падрабязна апісаны розныя канцэптуальныя падыходы ў вылучэнні адцягненай лексікі – марфалагічны, словаўтваральны, сінтаксічны, семантычны, стылістычны. Яшчэ адзін падыход – лагічны – прапануецца ў публікацыях Кацярыны Борушкінай [1]. На думку даследчыцы, падобная лексіка ўзнікла ў выніку ізалявальнага (ад самога прадмета) абстрагавання.

Прапанаваны падыход прымяняецца і пры аналізе адцягненай лексікі ў Кітабе А. Хасяневіча. Яе аб'ём складае не менш за 550 лексем (асобныя напісанні патрабуюць дадатковага графалагічнага і этымалагічнага высвятлення, з гэтай прычыны прыведзеныя ў публікацыі статыстычныя даныя носяць не канчатковы характар). У склад адцягненай лексікі ўключаюцца толькі назоўнікі, таму што толькі з іх дапамогай можна ўявіць у мове адцягненую ад носьбіта якасць або адцягненае ад сітуацыі дзеянне; застаюцца па-за межамі адцягненай лексікі гіперонімы, зборныя назоўнікі і субстантываваныя прыметнікі.

Вынікі і іх абмеркаванне. Паводле характару ўтварэння назоўнікі з адцягненым значэннем у Кітабе А. Хасяневіча аб'ядноўваюцца ў наступныя групы: а) нематываваныя назоўнікі; б) назоўнікі, утвораныя марфалагічным спосабам (бяссуфіксным і шляхам афіксацыі); в) назоўнікі, якія ўзніклі семантычным шляхам.

Прапанаваная класіфікацыя носіць умоўны характар. Не выдзяляюцца ў асобную групу іншамоўныя абстрактныя назвы, паколькі ў мове манускрыпта яны не адыгрываюць нейкай асобнай ці адрознай ролі ў параўнанні з падобнымі славянскімі назвамі. Іншамоўныя абстрактныя назоўнікі больш лагічна разглядаць у складзе першых дзвюх груп, паколькі адны з іх (і гэта большая частка назваў) былі запазычаны яшчэ ў старабеларускі перыяд, прайшлі стадыю адаптацыі, замацаваліся ў слоўніку старабеларускай мовы, іх сувязь з утваральнай асновай, прынамсі, у рамках сінхроннага падыходу, не праяўляецца, напрыклад: *афара (офара, ефара)* 'ахвярапрынашэнне'; 'міласціна', *ґвалт* 'парушэнне прынятых норм у якой-н. сферы'; 'прымус, прымушэнне'; 'кліч аб паратунку', *дастамент* 'запавет, наказ', *жарт, зрок, ламент* 'лямант', *лос* 'лёс', *мамент, моц, нендза* 'беднасць, галеча', *пиха* 'пыха, ганарлівасць', *сенс* 'сэнс', *схацки* 'спатканне', *фигла* 'падман' ды інш.

Іншыя абстрактныя назвы іншамоўнага паходжання, выяўленыя ў манускрыпце, наадварот, захоўваюць сувязь з утваральнымі асновамі. Гэта адносіцца, напрыклад, да лексікі польскага паходжання, утворанай бяссуфіксным спосабам, – *вимове* 'апраўданне, адгаворка', *обмова* 'абгавор', *павага (повага)*, *пакута* ды інш., а таксама да слоў суфіксальнага ўтварэння – *вентпливосц* 'сумненне', *свентобливесц* 'набожнасць', *заздросц (зайздросц)* ды інш. Пры разглядзе суфіксальных дэрыватаў у кітабе неабходна мець на ўвазе тое, што ў беларускай мове былі тыя самыя фарманты, што і ў польскай (напр., *-осць, -ств-*), і правесці дакладную мяжу паміж утварэннямі, запазычанымі з польскай мовы, і самастойнымі новаўтварэннямі не заўсёды магчыма [2, с. 242]. Па гэтай прычыне іншамоўныя словы з адцягненым значэннем, утвораныя марфалагічным спосабам, разглядаюцца разам з аналагічнымі паводле ўтварэння славянскімі назвамі.

Такім чынам, у публікацыі аб'яднаны ў адзін лексічны разарад славянскія і іншамоўныя абстрактныя нематываваныя назоўнікі для вывучэння іх крыніцы паходжання, значэння, графіка-арфаграфічнага афармлення, выяўлення ступені замацаванасці ў слоўніку новай беларускай мовы. Да ліку ***нематываваных*** адносяцца назоўнікі, якія пры сінхронным разглядзе не выяўляюць сувязі са сваімі ўтваральнымі асновамі. Такія назоўнікі адсутнічаюць у рэестры "Словаўтваральнага слоўніка беларускай мовы" [3] – *вина* 'правіннасць, грэх', *гнев, грех* 'грэх, віна, правіннасць; зло',

дар, карисц, лиха, справа ‘дзейнасць’, *памец, пригода* ‘выпадак; бяда, непрыемнае здарэнне’, *спор* ‘удача, поспех’, *спосаб* ‘прыём, метад ажыццяўлення чаго-н.’; пэўны парадак або характар чаго-н.’; ‘магчымасць ажыццяўлення чаго-н.’, *узор* ‘прыклад’, *чесц* ‘пашана, шанаванне’, *шчасце* і да т.п.

Гэта найбольш старажытная паводле паходжання лексіка. Лічыцца, што яшчэ ў агульнаславянскі перыяд за такімі назвамі замацавалася адцягненае значэнне стану, дзеяння або прыметы. Паводле спосабу ўтварэння яны ўзнікалі пераважна ад назоўнікавых, прыметнікавых і дзеяслоўных асноў, але цяпер словаўтваральныя афіксы ў такіх словах ужо не выдзяляюцца. У слоў, якія складаюць аналізуемы лексічны разрад, этымалагічныя сувязі аднаўляюцца цяжка. У дачыненні да некаторых з іх нельга з упэўненасцю вызначыць, у які бок ішло ўтварэнне – ад назоўніка да дзеяслова ці наадварот, на гэты конт у навуковай літаратуры ёсць супрацьлеглыя думкі. Увогуле гэта разнамасная група агульнаславянскіх назоўнікаў, якія ўтварыліся пры дапамозе старажытнага тэматычнага суфікса (*беда, вола, вера, гнев*), у рамках сінхроннага словаўтварэння такія словы называюць яшчэ назоўнікамі з нулявымі суфіксамі [4, с. 39–40]; іншыя сфарміравалася ў выніку афіксальнага (*беседа* < *bez-seda, закон, сме-х, да-р, сла-в-а, с-мер-ц, напас-ц* ‘гора, бяда’ і пад.) або бяссуфікснага ўтварэння (*блуд* ‘памылка’ ад *blęsti < *blędti).

Не выдзяляюцца фарманты і ў цэлай групы абстрактных слоў, якія, магчыма, параўнальна нядаўна страцілі сувязь з вытворнымі асновамі – *дастатак* ‘заможнасць’, *кривда* ‘крыўда’; ‘несправядлівасць’; ‘ганьба’, *правда* ‘тое, што адпавядае рэчаіснасці, ісціна’, *смутак, парадак, причина* ‘акалічнасць, якая выклікае іншую акалічнасць’; ‘заступніцтва, падтрымка, хадайніцтва’.

Тыя ***іншамоўныя*** абстрактныя назоўнікі, якія пры сінхронным падыходзе можна разглядаць як нематываваныя, паходзяць з розных крыніц – польскай, лацінскай, нямецкай, чэшскай, грэчаскай моў. Найбольш у кітабе засведчана слоў польскага паходжання, якія замацаваліся яшчэ ў слоўніку старабеларускай мовы і знайшлі адлюстраванне ў мове кітаба: *зрок*, *моц, нендза*, *пиха*, *цнота* ‘маральная чысціня, прыстойнасць’, *шлуб* ‘шлюб’ ды інш. Значная частка абстрактнай лексікі належыць да ліку лацінізмаў, запазычаных праз старапольскае пасрэдніцтва: *дастамент (дестамент)*, *квота* ‘норма, доля дапушчальнай колькасці’, *колер, ламент*, *мамент*, *минута* ‘момант, пара’, *натура* ‘сутнасць’, *парсуна (персуна)* ‘аблічча, лік’, *сенс*. Дастаткова прыкметную групу ўтвараюць таксама абстрактныя назвы нямецкага паходжання: *афара (офара, ефара)*, *ґвалт*, *дзенки* ‘падзякі’, *жарт, лос* ‘лёс’, *рада* ‘парада’, *фигла*, *фришт* ‘адтэрміноўка’. Адзінкавымі аказаліся лексемы з чэшскай мовы: *йалмужна* ‘міласціна’, *праца*.

У агульным аб’ёме нематываваныя назоўнікі займаюць пятую частку абстрактных назваў, выкарыстаных у манускрыпце. Пераважаюць абстрактныя назвы ***славянскага*** паходжання – 95 лексем, або 67%, колькасць ***іншамоўных*** – 46 лексем, або 33%. Група іншамоўных слоў у разрадзе нематываваных назоўнікаў найбольш прадстаўнічая і складае асаблівасць мовы кітаба, таму што ў другім лексіка-семантычным разрадзе, які складаецца з назоўнікаў, утвораных марфалагічным спосабам, іх значна менш, а ў агульным аб’ёме абстрактных назваў іншамоўныя словы, без уліку арыенталізмаў, складаюць каля 20%.

Нематываваныя назоўнікі з адцягненым значэннем як славянскага, так і іншамоўнага паходжання дэманструюць відавочную устойлівасць, здольнасць да захавання. Не менш як 95% лексікі гэтага разраду, засведчанай у кітабе першай трэці XIX ст., адзначаецца ў Гістарычным слоўніку беларускай мовы (ГСБМ) [5], пісьмовых помніках старабеларускай мовы. Бадай, толькі адзінкавыя словы не маюць пацвярджэння ў Гістарычным слоўніку (напр., *спор* ‘удача, поспех’, *абисце* ‘здарэнне, прыгода’ ды інш.). Гэтая акалічнасць дае падставы гаварыць пра відавочную лексічную пераемнасць паміж старабеларускай і новай беларускай мовай, на што асобна ў сучасным мовазнаўстве звяртаецца ўвага даследчыкаў у рамках адносна новага канцэптуальнага падыходу [6, с. 53–54].

Варта адзначыць і тое, што пераважная большасць абстрактных нематываваных назоўнікаў, выяўленых у Кітабе А. Хасяневіча (1832), захоўваецца ў сучаснай беларускай мове. Так, з ліку 46 іншамоўных 28 лексем (60%) замацаваліся ў слоўніку сучаснай беларускай літаратурнай мовы, а з ліку 95 славянскіх – 86 лексем (90%). Гэтая акалічнасць магла быць абумоўлена рознымі фактарамі, у прыватнасці, такімі, як замацаванне за гэтымі словамі адцягненых значэнняў яшчэ ў агульнаславянскі перыяд, своеасаблівым статусам гэтых назоўнікаў, якія ў сістэме абстрактных назваў абазначаюць найважнейшыя паняцці разумовай дзейнасці і эмацыянальнай сферы.

У рамках аналізуемага лексіка-семантычнага разраду вылучаюцца стрыжнёвыя лексемы, якія шматразова паўтараюцца ў розных тэкстах помніка. Да ліку іх належаць адцягненыя назоўнікі *грех* і *вера* – можна сказаць, цэнтральныя паняцці ісламскай дактрыны. У кітабе яны маюць самы высокі паказчык ужывання: слова *грех* выкарыстоўваецца 146, слова *вера (вара)* – 78 разоў (параўн. частотнасць ужывання іншых, бліжэйшых па колькасці выкарыстання абстрактных назваў: *смерц* – 52 разы, *розум* – 42 разы, *вола* ‘воля’ – 36 разоў).

Асаблівасцю абстрактных нематываваных назоўнікаў з'яўляецца выражэнне імі толькі адцягненых паняццяў. Колькасць такіх слоў у межах адзначанага разраду складае каля 80%. Напрыклад, толькі з адцягненым значэннем або з некалькімі адцягненымі значэннямі ўжываюцца назоўнікі, якія абазначаюць:

а) псіхічны стан і адчуванне: *бол, вина*, *гнев, грех*, *жал* 'шкадаванне, раскаянне'; 'смутак', *кривда*, *надзейа, напасц*, *памец, пахиба* 'сумненне', *слава, смутак (смутек), страх; спор*, *шчасце*;

б) адцягненае дзеянне і (адначасова) вынік гэтага дзеяння: *голас, игри* 'забавы, пацехі', *крик, музыки* 'танцы', *плач, причина* 'заступніцтва, падтрымка, хадайніцтва', *реч* 'прамова, выказванне, маўленне, гаворка', *смех, справа* 'дзейнасць, занятак'; 'учынак', *чара* 'чарадзейства', *чесц*;

в) прымету: *пиха*, *хлоба* 'ганарлівасць', *цнота*, *нендза*, *моц*;

г) фізіялагічны стан і адчуванне: *голад*, *хмел* 'стан ап'янення', *ценж* 'цяжарнасць' ды інш.

Некаторыя нематываваныя абстрактныя назоўнікі абазначаюць і канкрэтныя, і абстрактныя паняцці. Да іх належаць, напрыклад, тэмпаральныя лексемы тыпу *гадзина, год, дзен, рок*, якія ў адных кантэкстах маюць цалкам канкрэтныя, абмежаваныя колькаснымі рамкамі значэнні, напр., *гадзина* 'часавы адрэзак, роўны 60 мінутам' (канкрэтнае значэнне) і 'пара́, момант, час' (адцягненае значэнне); *год* 'адрэзак часу ў 12 месяцаў' (канкр.) і 'узрост' (адцягн.). Параўн.: *нагийе ѓисече год там стайац бӯдуц 'е кеторийе из иманем зешли за 'аднӯ гадзину прейдзе* (23а8); *голас пришов тайе ж гадзини и 'еѕра'ил прийми ѐелам прароцки пашанӯй йего* (103б8).

Спалучэнне канкрэтнага і адцягненага значэнняў назіраецца таксама і ў назоўніках такой тэматычнай групы, як саматычныя назвы, словы *бок, живот, нутр* у прамым значэнні абазначаюць часткі цела чалавека, а ў пераносным – адцягненыя паняцці. Так, напр., назоўнік *нутр* фіксуецца, акрамя прамога, з некалькімі пераноснымі значэннямі: 'унутраная сутнасць, думкі, перакананасць, настрой, унутраны стан чалавека', 'аснова, стрыжань чаго-н.':: *и ти не бӯдз таким жеби мев нутр* (думкі) *дац гетаму ćвету* (105а3); *хто душой нутром* (=унутранай перакананасцю) *и йезикам пейӯчи 'и ӯчинак ведлуґ йего чинеце ведай алхемду ѐӯрей пецйа* (38б8); *не фрасӯйćе нутр* (=стан, настрой) *тримай весолей* (95б4); *'у кажней речи йест нӯтр* (=аснова, стрыжань) *и серце а в кӯр'ане нӯтр и серце йѐн ѐӯрей* (9б12).

Найбольш паказальным у гэтах адносінах з'яўляецца назоўнік *реч*. Ён фіксуецца ў манускрыпце не менш за 127 разоў з 3 канкрэтнымі (1–3) і 7 адцягненымі (4–10) значэннямі: *1. Неадушаўлёны прадмет, рэч. 2. Орган, частка цела. 3. Рэчыва. 4. Факт, з'ява, падзея рэчаіснасці. 5. Справа, дзейнасць, дзеянне, учынак. 6. Выпадак. 7. Правіла, пункт правіла. 8. Тэма, прадмет абмеркавання, увагі, думкі. 9. Колькасць. 10. Рыса, якасць.* Гэта, бадай, адзіны ў сваім разрадзе назоўнік, які развіў такую колькасць адцягненых значэнняў. Нават у адным кантэксце ён імкнецца абазначаць розныя з іх: *четири речи* (=якасці) *челевеке здобец йак дараґӣ камен.. перши розум вера встидливоćц ӯчинек добрӣ.. а четирма речеми* (=учынкамі) *лихими тийе четири добрийе запсӯйе.. йак зазлӯйецца загине розум.. йак блӯд 'учиниц загине вера.. йак на што паквапицца ѐгине 'у йаго 'ус*[ты]*диливоćц.. йак прагавор 'учиниц загине' учинек добрӣ* (72а5-12).

Такім чынам, нематываваныя абстрактныя назоўнікі з'яўляюцца спецыяльным сродкам выражэння адцягненых паняццяў у манускрыпце ў цэлым, паколькі за пераважнай большасцю іх замацаваліся толькі адцягненыя значэнні. Словы, у якіх сумяшчаюцца адцягненыя значэнні з канкрэтнымі, складаюць меншасць – каля 20%. Як паказвае назіранне, у такіх словах першасным значэннем з'яўляецца канкрэтнае, а пераноснае – вынікам семантычных зрухаў, якія абумоўліваюцца кантэкстам.

Абстрактная нематываваная лексіка ў манускрыпце характарызуецца дастаткова ўстойлівым графіка-арфаграфічным і граматычным афармленнем. Толькі ў асобных выпадках назіраецца граматычная варыянтнасць, напрыклад: *жал* (жаль) і *жала* (жаля), *звада* і *звад* 'сварка, разлад' (варыянт, які ў тэкстах сустракаецца часцей, запісаны першым). У ГСБМ адзначаюцца першыя варыянты – *жаль, звада*, формы *жаля, звад* у кітабе ўжываюцца ў адзінкавых кантэкстах і ўспрымаюцца як вузкадыялектныя. У выкарыстанні граматычных варыянтаў семантычнай розніцы не выяўляецца.

У межах дадзенага разраду назіраецца канкурэнцыя паміж уласнымі і/або іншамоўнымі сродкамі, у выніку чаго ў кітабе суіснуюць сінанімічныя сродкі выражэння адцягненых паняццяў, напрыклад: *парсуна* (з лац.) (4 ужыванні) – *аблича* (2) у значэнні 'воблік, аблічча', *старана* (11) – *бок* (1) 'размяшчэнне чаго-н. адносна чаго-н.', *справа* (3) – *дзела* (2) 'занятак, дзейнасць, справа', *фрасунак* (праз ст.-польск., са ст.-чэш.) (11) – *смутак* (3) 'смутак, журба', *цуда* (з польск.) (3) – *дзива* (2) 'цуд' ды інш.

У межах манускрыпта праяўленне лексічнай варыянтнасці і лексічнай сінаніміі назіраецца шырэй. Так, адцягненае паняцце 'жыццё' абазначаецца лексічнымі варыянтамі – нематываваным словам *живот* і словамі суфіксальнага ўтварэння *жицйо, житло*; параўн. такса-

ма: *аблича, парсуна* (сінанімічныя нематываваныя назвы) і *абличнасц* (суфіксальная назва, лексічны варыянт да *аблича* і сінанімічны да *парсуна*).

Некаторыя лексемы з ліку нематываваных абстрактных назваў ужываюцца ў беларускай або польскай графіка-арфаграфічнай рэдакцыі з перавагай адной або, радзей, прыкладна ў парытэтных суадносінах. Гэта формы *вера* і *вара* (вяра), *голас* і *ґлос* ці *глос*, *голад* і *ґлод*, *грех* і *ґрех*, *довг* і *длуґ*, *парадак* і *парондак*, *памец* і *поменц*, *дарога* і *дроґа* 'падарожжа, паездка', 'напрамак дзейнасці, рашэнне'. Напрыклад, назоўнік *вара* (*вяра*) зафіксаваны ў польскіх і беларускіх тэкстах помніка, назоўнік *вера* – толькі ў беларускіх. Дамінуючай лексічнай нормай з'яўляецца форма *вера*, яна адзначаецца не менш за 59 разоў, форма *вяра* – 19. Семантычнага адрознення ў іх ужыванні не назіраецца, ва ўсіх кантэкстах яны маюць значэнне 'рэлігія, веравызнанне' і праяўляюць аднолькавыя валентныя магчымасці. Наяўнасць графіка-арфаграфічных варыянтаў з адлюстраванымі польскімі фанетычнымі рысамі тлумачыцца роляй польскай мовы ў 1-й палове XIX ст. на тэрыторыі тагачаснай Беларусі. Увогуле ў Кітабе Абрагіма Хасяневіча беларускамоўныя варыянты, як правіла, дамінуюць (параўн. таксама: лексема *грех* фіксуецца не менш за 143 разы, запісаная з улікам польскай фанетыкі дублетная форма *ґрех* – 3 разы; *гнев* – 6 разоў і *ґнев* – 1 раз, *довг* і *длуґ* – 3 і 1 адпаведна).

Абстрактныя назоўнікі, афармленыя па-беларуску і па-польску, у беларускіх і беларуска-польскіх кантэкстах семантычна ўзаемазамяняльныя. Можна нават сказаць, што польскія формы, якія суіснуюць з беларускімі, выкарыстоўваюцца, бадай што, без пэўнай сістэмы, хаця і не заўсёды. Семантычная дыферэнцыяцыя ў асобных выпадках усё ж мае месца, яна ўласціва, напрыклад, словам *бленд* і *блуд*. Першае з іх выкарыстоўваецца ў манускрыпце толькі са значэннем 'памылка': *хто би не мев на'уки 'учицисе и питацисе той челевек 'у велким блендзе йест* (76а12). Другое слова, акрамя згаданага, мае яшчэ значэнне 'распуста': *ӣ кафире йестесце в йавним блӯдзе* (=памылцы) *и в цемнасци* (21а23): *йешче видзев 'адзин пулк блӯдних жанок йени кричац 'уздихайуц .. мӯвил гетийе што чинили на свеце сказав тий*[е] *мужов не слӯхали 'улехце мели цӯдзелоства чинили .. дла тего йих 'адзене смаланойе блӯд* (=распусту) *чинӯшчи лӯдзей такийе биди бӯдуц* (107б3-6).

Адносна сціплая варыянтнасць, якая назіраецца пры абазначэнні адцягненых паняццяў нематываванымі назоўнікамі, сведчыць пра ўстойлівае графіка-арфаграфічнае афармленне дадзенага лексічнага разраду ў кітабе.

Заключэнне. Абстрактныя нематываваныя назоўнікі ў помніку складаюць пятую частку ад агульнай колькасці абстрактных назваў. Аснову гэтага лексічнага разраду ўтвараюць славянскія назвы, якія страцілі сувязь са сваімі ўтваральнымі асновамі. Паводле тэматычнай накіраванасці нематываваныя назоўнікі абазначаюць стан, адчуванне, адцягненае дзеянне і/або вынік гэтага дзеяння, прымету.

Нематываваныя назоўнікі з адцягненым значэннем славянскага і іншамоўнага паходжання праявілі высокую ўстойлівасць да захавання ў мове ў розныя перыяды: 95% лексікі гэтага разраду, засведчанай у кітабе першай трэці XIX ст., уваходзіла ў слоўнік старабеларускай мовы XV–XVI стст. і прыкладна 80% яе замацавалася ў слоўніку сучаснай беларускай літаратурнай мовы. Гэтая акалічнасць сведчыць пра лексічную пераемнасць паміж старабеларускай і новай беларускай мовай, адзін з узораў якой дэманструецца ў кітабе першай трэці XIX ст.

Абстрактныя нематываваныя назоўнікі з'яўляюцца спецыяльным сродкам выражэння адцягненых паняццяў у манускрыпце, паколькі ў пераважнай большасці (80%) яны маюць толькі адцягненыя значэнні, 20% нематываваных назоўнікаў сумяшчаюць канкрэтныя і абстрактныя значэнні.

Абстрактная нематываваная лексіка характарызуецца дастаткова ўстойлівай літаратурна-пісьмовай унармаванасцю, варыянтнае графіка-арфаграфічнае і граматычнае афармленне адзначаецца ў невялікай колькасці нематываваных назоўнікаў, што сведчыць пра ўстойлівасць дадзенага лексічнага разраду ў кітабе.

Літаратура

1. Борюшкина, Е.Н. Отвлеченная лексика в Толковой Палее / Е.Н. Борюшкина: автореф. ... дис. канд. филол. наук. – М., 2013. – С. 8.
2. Булыка, А.М. Лексічныя запазычанні ў беларускай мове XIV–XVIII стст. / А.М. Булыка. – Мінск: Навука і тэхніка, 1980. – 256 с.
3. Бардовіч, А.М. Словаўтваральны слоўнік беларускай мовы / А.М. Бардовіч, М.М. Круталевіч, А.А. Лукашанец. – Мінск: Беларуская навука, 2000. – 413 с.
4. Николаев, Г.А. Русское историческое словообразование: Теоретические проблемы / Г.А. Николаев. – М.: Либроком, 2010. – 184 с.
5. Гістарычны слоўнік беларускай мовы. – Мінск: Навука і тэхніка, 1982–2015. – Вып. 1–35.
6. Гапоненка, І.А. Лексіка беларускай літаратурнай мовы XIX – пачатку XX ст.: асаблівасці станаўлення і развіцця / І.А. Гапоненка. – Мінск: БДУ, 2015. – 307 с.

Паступіў у рэдакцыю 21.06.2016 г.